Аляксандар Лукашэнка можа быць запрошаны на саміт ЭЗ у Брусэлі

Абраны сьпікер парлямэнту

«Справа 14-ці» працягваецца

Глябальны крызыс памалу закранае беларускіх экспартэраў

Беларусы зарабілі 4 мільёны даляраў на дзіцячай парнаграфіі

ТБМ рыхтуецца да другой агульнанацыянальнай дыктоўкі

Беларусі неабходна зрабіць значныя крокі ў напрамку лібэралізацыі эканомікі і «дэбюракратызацыі ўсёй сыстэмы». Такую задачу паставіў прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка на нарадзе 30 кастрычніка. Прычым, зь ягоных словаў, ужо «да 1 студзеня ў гэтым пляне мы мусім зрабіць максымум».

У прыватнасьці, кіраўнік дзяржавы заявіў, што варта спрасьціць парадак рэгістрацыі прадпрыемстваў, аж да заяўнага прынцыпу ў сфэрах вытворчасьці ды паслугаў, адмовіцца ад празьмернага кантролю над даходамі грамадзянаў.

Экспэрты мяркуюць, што кіраўніцтва краіны зрабіла стаўку на варыянт аўтарытарнай мадэрнізацыі. Гаворка ідзе пра тое, каб паскорыць працэс прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў, стварыць прывабны інвэстыцыйны клімат, укараніць новыя тэхналёгіі. Разам з тым, Лукашэнка ні слова ня кажа пра магчымасьць рэформаў у палітычнай сфэры.


naviny.by

Між тым Эўразьвяз чакае менавіта крокаў у кірунку дэмакратызацыі, гарантаваньня захаваньня правоў чалавека ды грамадзянскіх свабодаў. Лукашэнка можа быць запрошаны на саміт Эўразьвязу ў першай палове 2009 году, калі ў краіне будуць праведзеныя дэмакратычныя рэформы. Пра гэта днямі заявіла ў інтэрвію бэльгійскаму выданьню “EUobserver” афіцыйная прадстаўніца МЗС Чэхіі Зузана Апляталава. Чэхія будзе старшыняваць у ЭЗ ад 1 студзеня 2009 году.

Тым часам 28 лістапада на сустрэчы ў Вільні лідэры Аб'яднаных дэмакратычных сілаў Беларусі (АДС) перадалі дэпутатам Эўрапарлямэнту свае прапановы што да складаньня так званай “дарожнай мапы” — умоваў, пры якіх магчымая далейшая нармалізацыя дачыненьняў між ЭЗ ды Беларусьсю.

Як паведаміў БелаПАН старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька, АДС маюць чатыры асноўныя прапановы:

- зьмена выбарчага заканадаўства;
- забесьпячэньне роўных умоваў працы мэдыяў і доступ апазыцыі да дзяржаўных СМІ;
- стварэньне ўмоваў для нармальнага функцыянаваньня і дзейнасьці палітычных партыяў;
- выключэньне з Крымінальнага кодэксу артыкулаў, што даюць магчымасьць перасьледу за грамадзкую ды палітычную дзейнасьць.

Кіраўніцтва АДС вырашыла да 10 лістапада сфармаваць ініцыятыўную групу дзеля збору подпісаў за зьмену выбарчага заканадаўства. Каб мець магчымасьць унесьці адпаведны законапраект у парлямэнт, найперш патрэбна сабраць 50 тысячаў подпісаў грамадзян.

Аналітыкі, аднак, выказваюць сумнеў, што ўлады зарэгіструюць

групу. Дагэтуль такіх прэцэдэнтаў у Беларусі не было: кожны раз чыноўнікі знаходзілі падставу, каб адмовіць актывістам у магчымасьці рэалізаваць канстытуцыйнае права грамадзянаў на заканадаўчую ініцыятыву.

Тым часам фінансава-эканамічная сытуацыя ў краіне становіцца болей напружанай.

У мэдыі пратачыліся зьвесткі, што цяжкасьці са збытам прадукцыі сталі зьведваць менскія аўтамабільныя ды трактарныя заводы. Паводле “Радыё Свабода”, кошт грузавікоў МАЗ, БелАЗ, трактараў “Беларус” вагаецца ад некалькіх дзясяткаў да сотняў тысячаў даляраў. На 90% такія ўгоды ажыцьцяўляюцца ў крэдыт. Са згортаньнем банкаўскага крэдытаваньня ў Расеі, ва Ўкраіне, іншых краінах, што купляюць беларускую прадукцыю, экспарт самазвалаў ды трактараў ужо зьнізіўся напалову. Цяпер сур'ёзна абмяркоўваецца пытаньне скарачэньня працоўнага тыдня на стратэгічных прадпрыемствах.

Канцэрн “Белнафтахім”, прадукцыя якога апошнія гады добра прадавалася ў Эўропе і давала краіне вялікія валютныя даходы, таксама перажывае зьніжэньне экспартных магчымасьцяў і рэзкае ўскладненьне рэалізацыі шэрагу асноўных




тавараў. Некаторыя замежныя спажыўцы нафтахімічнай прадукцыі адмаўляюцца ад раней заяўленых кантрактаў. Пра гэта заявіў 28 кастрычніка міністар эканомікі Мікалай Зайчанка.

На думку незалежнага эканаміста Ярослава Раманчука, усясьветны фінансавы крызыс ужо закрануў Беларусь, “таму што прадпрыемствы, інвэстары ўжо карэктуюць інвэстыцыйныя пляны. Ужо на прадпрыемствах Беларусі скарачаюцца замовы і адбываецца затаварваньне складаў”.

Экспэрт прагназуе, што Беларусь можа быць накрытая другой хваляй гэтага крызысу.

Ужо зараз відавочна, што шэраг важных макраэканамічных паказчыкаў ня ўдасца ўтрымаць у межах гадавога прагнозу. Так, інфляцыя, як мусіў прызнаць 28 кастрычніка міністар эканомікі, складзе сёлета 14%. Раней урад плянаваў утрымаць яе ў межах 6–8%. Адмоўнае сальда замежнага гандлю па выніках 8 месяцаў склала 2,1 мільярда даляраў пры гадавым прагнозе 1,4 мільярда.

Урад мусіць рабіць тэрміновыя захады, каб мінімізаваць уплыў усясьветнага крызысу. Так, днямі былі падпісаныя дамовы з “Эксімбанкам” Кітаю аб крэдытах агульным памерам 390 мільёнаў даляраў. Трохі раней урад дамовіўся пра крэдыт ад Расеі ў памеры 2 мільярды даляраў і запрасіў яшчэ 2 мільярды даляраў стабілізацыйнага крэдыту ад Міжнароднага валютнага фонду. Гэтымі днямі адмысловая місія МВФ вядзе ў Менску перамовы пра ўмовы даваньня крэдыту.

Прадстаўнікі Нацыянальнага банку Беларусі сьцьвярджаюць, што гэтая пазыка патрэбная, каб стварыць для банкаў “падушку бясьпекі”. Паводле лёнданскай “Financial Times”, беларускі бок паведаміў МВФ, што мае намер правесьці шэраг эканамічных рэформаў, у межах якіх будуць часткова прададзеныя активы дзяржаўных прадпрыемстваў.

“Financial Times” падкрэсьлівае, што банкаўская сыстэма Беларусі, якая не вызначаецца моцнай разгалінаванасьцю, толькі нязначна пацярпела ад усясьветнага фінансавага ды крэдытнага крызысу. Аднак пэрспэктыва спаду ў эканоміках ЗША ды краінаў Эўразьвязу пагражае нэгатыўна адбіцца на беларускім экспарце.

Між тым замежнапалітычная стратэгія Менску па-ранейшаму палягае ў манэўраваньні між Расеяй і Захадам. 25 кастрычніка на ініцыятыву Лукашэнкі пад Масквой адбылася яго сустрэча з прэзыдэнтам Расеі Дзьмітрыем Мядзьведзевым. Госьць зьвярнуў увагу гаспадара сустрэчы на тое, што блізу паловы золатавалютных рэзэрваў Беларусі захоўваецца ў расейскіх рублях. Гэтая доля сьвядома нарошчвалася з мэтай зьменшыць залежнасьць ад даляра ва ўмовах эканамічных санкцый з боку ЗША.

Зараз Менск, апэлюючы да прынцыпаў саюзьніцтва, дамагаецца фінансавай падтрымкі ды эканамічных прэфэрэнцый ад Крамля, паралельна спрабуючы арганізаваць прыток крэдытаў ды інвэстыцыяў з Захаду.

Аднак экспэрты робяць выснову, што на згаданай экстраннай сустрэчы Лукашэнка і Мядзьведзеў ня здолелі дамовіцца па шэразе важных пытаньняў.

У прыватнасьці, цераз два дні амбасадар Расеі Аляксандар Сурыкаў




заявіў, што кошт на газ для Беларусі ў наступным годзе будзе блізу $200 за тысячу кубамэтраў. У беларускі ж бюджэт на 2009 год закладзеная цана $140.

Масква таксама абставіла даволі жорсткімі ўмовамі выдачу крэдыту на 2 мільярды даляраў, першую траншу якога (1 мільярд) мяркуецца даць ужо сёлета. У прыватнасьці, гаворка ідзе пра доступ расейскіх кампаніяў на беларускі рынак, удзел расейскага капіталу ў прыватызацыі прадпрыемстваў, магчымым выкарыстаньні расейскага рубля як агульнай валюты разьлікаў ці рэзэрвовай валюты.

Экспэрты дадаюць, што неафіцыйна адной з умоў можа быць прызнаньне Менскам незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі. Аднак, паколькі такі крок пагражае сарваць нармалізацыю дачыненьняў з Захадам, Лукашэнка наважыўся як мага долей “цягнуць рызіну”, лічаць незалежныя аналітыкі.

ПАЛІТЫКА

## Аляксандар Лукашэнка можа быць запрошаны на саміт ЭЗ у Брусэлі

***Прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка можа быць запрошаны ў 2009 годзе на адзін з самітаў Эўразьвязу ў Брусэлі. Пра гэта паведамляе «РИА Новости» са спасылкай на бэльгійскія СМІ.***

Такую магчымасьць агучыў у прэсе намесьнік міністра замежных справаў Чэхіі Томас Пояр, які 24 кастрычніка наведаў з аднадзённым рабочым візытам Беларусь. Паводле ягоных словаў, кіраўніцтва Чэхіі, якой Францыя перадасьць ратацыйнае старшынства ў ЭЗ 1 студзеня 2009 году, разглядае варыянт магчымага ўдзелу беларускага прэзыдэнта ў саміце ЭЗ, які пройдзе ў фармаце «27 плюс 6» — краіны-сябры ЭЗ плюс Грузія, Армэнія, Азэрбайджан, Украіна, Малдова й Беларусь.

Нагадаем, міністры замежных справаў краінаў Эўразьвязу на паседжаньні 13 кастрычніка ў Люксэмбургу прыпынілі на паўгоду дзеяньне забароны на ўезд у краіны ЭЗ Аляксандру Лукашэнку і 35 беларускім чыноўнікам.

Прэзыдэнт Беларусі быў унесены ў сьпіс неўязных у красавіку 2006 году.

*Паводле БелаПАН*

АФІЦЫЙНА

## Абраны сьпікер парлямэнту

***Сьпікерам Палаты прадстаўнікоў чацьвертага скліканьня абраны дэпутат па Глыбоцкай выбарчай акрузе, старшыня Віцебскага аблвыканкаму Ўладзімер Андрэйчанка.***




Са 109 дэпутатаў, якія прагаласавалі, «за» выказаліся 107 дэпутатаў, «супраць» — 1, і 1 бюлетэнь прызнаны несапраўдным.

У парадку дня сёньняшняй сэсіі сем пытаньняў. Усе яны тычацца абраньня новага кіраўніцтва Палаты прадстаўнікоў, стварэньня сталых камісій і асабістага складу чальцоў гэтых камісіяў.

Згодна з рэглямэнтам сьпікер і ягоны намесьнік абіраюцца праз патаемнае галасаваньне.

АПАЗЫЦЫЯ

## «Справа 14-ці» працягваецца

***Дэмакратычная й грамадзянская супольнасьць патрабуе тэрміновага вызваленьня актывіста Аляксандра Баразенкі. Малады чалавек праходзіў па гэтак званай «Справе 14».***

Яе ўдзельнікі абвінавачваліся ва ўдзеле ў мітынгу прадпрымальнікаў у Менску ў студзені бягучага году. Аляксандар Баразенка не выклікаўся у суд, паколькі навучаўся ў Польшчы. Пазьней ён прыехаў да бацькоў, але выехаць назад ня змог. 27 кастрычніка ён зьвярнуўся ў менскую міліцыю, дзе й быў арыштаваны па «Справе 14-ці».

У дадзены момант Аляксандар Баразенка знаходзіцца ў сьледчым упраўленьні сталічнай міліцыі на вуліцы Валадарскага.

Па «Справе 14» праходзіў, між іншым, Андрэй Кім, які быў асуджаны на 1,5 году калёніі.

ЭКАНОМІКА

## Глябальны крызыс памалу закранае беларускіх экспартэраў

***Буйныя беларускія прадпрыемствы маюць цяжкасьці з-за фінансавага крызысу, паведамляецца на сайце «Хартыя'97». Сярод іх — «Беларуськалій», Менскі трактарны завод і Менскі аўтазавод.***




photo.bymedia.net

Працоўныя баяцца прымусовых адпачынкаў і затрымак з выплатай заробкаў.

Начальнік упраўленьня продажаў грузавой тэхнікі МАЗу Сяргей Захарэвіч пацьвердзіў, што цяжкасьці з продажам машынаў за мяжу ў прадпрыемства сапраўды назіраюцца. У тым, што існуюць праблемы з экспартам, прызнаўся й адказны супрацоўнік адміністрацыі прадпрыемства «Беларуськалій».

Кіраўніцтва МТЗ пакуль не пацьвярджае ніякіх наступстваў крызысу, аднак фактычна трактары застойваюцца на складах прадпрыемства.

ГРАМАДЗТВА

## Беларусы зарабілі 4 мільёны даляраў на дзіцячай парнаграфіі

***У Італіі завершылася сьледзтва па крымінальнай справе, якая тычылася сайту дзіцячай парнаграфіі. Як высьветлілася падчас сьледзтва, сайтам кіравалі зь Беларусі.***

Пад падазрэньнем знаходзяцца 83 асобы зь Італіі, двое ўжо арыштаваныя. Італьянская паліцыя канфіскавала 100 кампутараў й каля 600 касэтаў. Вядомыя таксама імёны беларусаў, якія былі адміністратарамі сайту. Сэрвэр быў зарэгістраваны ў ЗША.

Як паведамляе агенцтва «Франс-Прэс», каб зайсьці на сайт, трэба было заплаціць 90 даляраў. Некаторыя асобы на наведваньне сайту трацілі ў месяц нават больш за тысячу даляраў. Беларусы-адміністратары зарабілі на гэтай бруднай справе да 4 мільёнаў даляраў.

КУЛЬТУРА

## ТБМ рыхтуецца да другой агульнанацыянальнай дыктоўкі

***Грамадзкае аб'яднаньне «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» аб'явіла пра пачатак падрыхтоўкі да II Агульнанацыянальнай дыктоўкі па беларускай мове. Акцыя прымеркаваная да Міжнароднага дня роднай мовы, што адзначаецца 21 лютага.***

У інтэрвію БелаПАН старшыня ТБМ Алег Трусаў паведаміў, што дыктоўка будзе праводзіцца з 21 лютага да канца сакавіка. «Гэтая акцыя дазволіць кансалідаваць беларускае грамадзтва вакол дзяржаўнай беларускай мовы, бо ў дыктоўцы возьмуць удзел ня толькі беларусы, але й грамадзяне краіны розных нацыянальнасьцяў, веравызнаньняў і палітычных поглядаў», — падкрэсьліў А. Трусаў.

Паводле ягоных словаў, напрыканцы гэтага году кіраўніцтва аб'яднаньня зьвернецца да ўладаў з прапановай падтрымаць дадзеную акцыю й вылучыць для яе правядзеньня чытальныя залі бібліятэк, клясы й аўдыторыі сярэдніх школаў і вышэйшых навучальных установаў.



photo.bymedia.net

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ БЕЛАРУСКАЯ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.